European Monitoring Centre for Drugs and Drug Addiction

# Кароткі агляд ЕЦМНН па аналізе тэндэнцый

Верасень 2020 г.

## Уплыў COVID-19 на рынкі наркотыкаў, ужыванне наркотыкаў, шкоду, звязаную з наркотыкамі, і меры рэагавання ва ўсходнееўрапейскіх краінах, уключаных у сферу Еўрапейскай палітыкі добрасуседства

**Сітуацыя ў дачыненні да пандэміі COVID-19 і мер рэагавання на яе працягвае імкліва развівацца. Абноўленая інфармацыя рэгулярна прыводзіцца Еўрапейскім цэнтрам прафілактыкі і кантролю захворванняў і Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя, а ў большасці краін даступны нацыянальныя рэкамендацыі па ахове здароўя насельніцтва. ЕЦМНН стварыў інфармацыйны рэсурс па COVID-19, які забяспечвае доступ да актуальных матэрыялаў па пытаннях, звязаных з наркотыкамі і COVID-19.**

З 2019 года ЕЦМНН пашырыў супрацоўніцтва з партнёрамі Еўрапейскай палітыкі добрасуседства ([1]) у рамках праекта EU4Monitoring Drugs (EU4MD), які фінансуецца ЕС. Праект падтрымлівае нацыянальную і рэгіянальную гатоўнасць выяўляць пагрозы бяспецы і здароўю, звязаныя з наркотыкамі, і рэагаваць на іх.

Funded by the European Union

EU4MD

([1]) Алжыр, Арменія, Азербайджан, Беларусь, Егіпет, Грузія, Ізраіль, Іарданія, Ліван, Лівія, Малдова, Марока, Палесціна*, Туніс і Украіна

*Гэта найменне не павінна трактавацца як прызнанне Дзяржавы Палесціна, і яно не ўшчамляе ўласныя пазіцыі дзяржаў-удзельнікаў па гэтым пытанні.

# Кароткі агляд

З пачатку 2020 года свет перажывае беспрэцэдэнтную надзвычайную сітуацыю ў галіне аховы здароўя, выкліканую пандэміяй каранавіруснай інфекцыі (COVID-19), якая прывяла да паступовага ўвядзення нацыянальнымі ўрадамі сацыяльнага дыстанцыравання і іншых мер кантролю. Каб даследаваць наступствы пандэміі і наступствы для рынкаў наркотыкаў, наркалагічных службаў і асоб, якія ўжываюць наркотыкі у краінах Еўрапейскай палітыкі добрасуседства (ЕПД), Еўрапейскі цэнтр маніторынгу наркотыкаў і наркаманіі (ЕЦМНН) запусціў даследаванне па аналізе тэндэнцый. Тут прыведзены кароткі агляд вынікаў даследавання аб уплыве, аказаным COVID-19 на рынкі наркотыкаў, паслугі, звязаныя з наркотыкамі, і асоб, якія іх ужываюць, у краінах усходняга кірунку ЕПД ([2]) з сакавіка па май 2020 года ([3]).

## Як змяніліся рынкі наркотыкаў?

- Даследаванне паказвае, што пасля ўвядзення мер ізаляцыі ў сувязі з COVID-19 рынкі наркотыкаў па ўсім рэгіёне скараціліся ў невялікіх ці сярэдніх маштабах, узніклі перабоі ў сістэме паставак, пра што сведчыць зніжэнне аб'ёмаў і колькасці канфіскацый на граніцах і павелічэнне рознічных цэн на пэўныя віды наркотыкаў у некаторых краінах (гл. малюнак).
- Ёсць падставы лічыць, што ў некаторых краінах такое парушэнне функцыянавання рынку, магчыма, падштурхнула да адраджэння дробнамаштабнай (хатняй) вытворчасці амфетамінаў.
- На рознічным узроўні пераважала бескантактная дзейнасць па збыце наркотыкаў. Па ўсёй верагоднасці, гэта было выклікана ўвядзеннем нацыянальных абмежаванняў на перамяшчэнне, узмоцненымі мерамі па ахове грамадскага парадку і стратэгіямі па стрымліванні распаўсюджвання COVID-19 шляхам абмяжоўвання кантактаў паміж людзьмі.
- Адначасова з гэтым у розных формах была закранута і праваахоўная дзейнасць, а зніжэнне зафіксаванай колькасці парушэнняў заканадаўства аб наркотыках можа адлюстроўваць часовыя змены нацыянальных прыярытэтаў. Так, фокус прыярытэтных задач паліцыі ў гэты перыяд зрушваецца ў бок забеспячэння грамадскай бяспекі і парадку.

---

([2]) Арменія, Азербайджан, Беларусь, Грузія, Малдова і Украіна

([3]) Поўны тэкст зводкі даступны на англійскай мове на сайце www.emcdda.europa.eu

МАЛЮНАК

**Змяненні цэн на наркотыкі і іх чысціні ў вызначаных краінах у першыя месяцы пандэміі COVID-19**

| | Цэны | | | | Адсутнасць прымесей | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Арменія | Грузія | Рэспубліка Малдова | Украіна | Арменія | Грузія | Рэспубліка Малдова | Украіна |
| Канабіс (смала, трава) | ↑ | ↑↑ | ↑ | ↑ | Невядома | Невядома | Невядома | Невядома |
| Гераін | ↑ | ↑↑ | ↑↑ | ↑ | Невядома | ↓ | Невядома | Невядома |
| Какаін | ↑ | Невядома | ↑↑ | ↑↑ | Невядома | Невядома | Невядома | ↓ |
| МДМА/экстазі | Невядома | ↑↑ | ↑ | ↑↑ | Невядома | Невядома | Невядома | Невядома |
| Амфетаміны | ↑ | Невядома | ↑ | ↑ | Невядома | Невядома | Невядома | Невядома |
| Новыя псіхаактыўныя рэчывы | Невядома | ↑↑ | Невядома | ↑ | Невядома | Невядома | Невядома | Невядома |
| ЛСД | Невядома | Невядома | Невядома | Невядома | Невядома | Невядома | Невядома | Невядома |

↑↑ Значнае павелічэнне, >20% ↑ Нязначнае павелічэнне, <20% ↓ Зніжэнне

*Крыніца*: Апытанне сярод нацыянальных экспертаў у праваахоўнай вобласці (звесткі пададзены Арменіяй (06.05.2020), Грузіяй (11.05.2020), Рэспублікай Малдова (24.04.2020) і Украінай (08.05.2020)).

## Які ўплыў быў аказаны на ўжыванне наркотыкаў, шкоду, звязаную з наркотыкамі, і паслугі аховы здароўя, звязаныя з наркотыкамі?

- Здаецца, што ўжыванне канабісу было закранута менш за ўсё, аднак адзначаецца розніца паміж тымі, хто ўжывае канабіс дзеля забавы, і тымі, хто робіць гэта на рэгулярнай аснове.
- Некалькі крыніц мяркуюць, што даступнасць большасці забароненых рэчываў, якія незаконна ўвозяцца ў рэгіён, напрыклад, гераіну, МДМА, амфетамінаў і какаіну, знізілася, што, як лічаць, прывяло да скарачэння ўжывання гэтых рэчываў, хаця на дадзены момант гэта цяжка абгрунтаваць эмпірычным шляхам.
- Лакальная нястача гераіну магла паспрыяць павелічэнню попыту на лячэнне: павялічылася колькасць спроб атрымаць доступ да паслуг апіоіднай замяшчальнай тэрапіі (АЗТ) і назіралася павышэнне попыту на лячэнне ад нарказалежнасці ўвогуле.
- Як уяўляецца, скарачэнне даступнасці некаторых вядомых забароненых наркотыкаў у пэўных кантэкстах прывяло да павялічанага ўжывання законных замянязльнікаў, такіх як алкаголь, ці злоўжывання фармацэўтычнай прадукцыяй, у тым ліку лекавымі прэпаратамі для АЗТ, ці іншымі псіхатропнымі фармацэўтычнымі рэчывамі, якія часта выкарыстоўваюцца разам з забароненымі рэчывамі.

- На пачатковых этапах прымянення нацыянальных мер па ізаляцыі назіраўся агульны спад у забеспячэнні медыцынскімі паслугамі, што паўплывала на большасць медыцынскіх паслуг, не звязаных з лячэннем COVID-19. У выніку гэтага, як відаць, асобы, якія ўжываюць наркотыкі, маглі адчуваць зніжэнне даступнасці да звычайных паслуг, звязаных з наркотыкамі, а таксама скарачэнне доступу да іх.У некаторых краінах таксама былі абмежаваны прыбыццё новых кліентаў з мэтай атрымання лячэння ад нарказалежнасці, у прыватнасці паслуг АЗТ, і доступ да аналізаў на інфекцыі, якія перадаюцца праз кроў.
- Нацыянальныя службы аховы здароўя і недзяржаўныя арганізацыі (НДА), якія займаюцца пастаўкамі іголак і шпрыцаў, ажыццявілі адаптацыі ў сваіх мадэлях абслугоўвання. Дзе гэта было магчыма, забяспечваліся дыстанцыйныя і мабільныя паслугі.
- Большасць краін рэгіёну хутка сталі прымяняць практыку забеспячэння лекамі АЗТ, якія можна ўзяць дамоў, тым самым гарантуючы бесперапыннае атрыманне лячэння. Ва Украіне назіраўся павышаны попыт на метадон, які атрымлівалі праз  лекараў, якія вядуць прыватную практыку.Абаронцы, якія адстойваюць інтарэсы людзей, якія ўжываюць наркотыкі, станоўча ацанілі новаўвядзенні нацыянальных праграм, хаця некаторыя паведамленні сведчаць пра неабходнасць больш дбайнага маніторынгу выканання рэжыму прыёму лекаў АЗТ дома, а таксама пра неабходнасць падтрымкі працы лекараў, якія практыкуюць прыватна.

## Якое ўздзеянне можа мець COVID-19 у доўгатэрміновай перспектыве на рынкі наркотыкаў, паслугі, звязаныя з наркотыкамі, і асоб, якія іх ужываюць, ва ўсходнім рэгіёне ЕПД?

- Вынікі гэтага даследавання і падобных даследаванняў у Еўропе і рэгіёне сведчаць пра тое, што, як толькі зноў будуць адкрыты граніцы, трэба будзе захоўваць пільнасць у адносінах да змяненняў дзейнасці крымінальных сетак і метадаў дыстрыбуцыі (рынкі бачнай і ценявой сеткі Інтэрнэт,зашыфраваная сувязь,персанальныя дастаўкі) (ЕЦМНН і Еўрапал, 2020 г.). Гэта таксама неабходна адлюстраваць у стратэгіях кампетэнтных органаў, і эксперты заклікаюць інвеставаць больш сродкаў у навучанне персаналу для таго, каб ён быў гатовы да рэагавання на новыя бізнес-мадэлі, якія ўзнікаюць на рынку наркагандлю.
- Што датычыцца ўжывання наркотыкаў, яшчэ невядома, які ўплыў будуць мець COVID-19 у доўгатэрміновай перспектыве і наступнае паслабленне мер ізаляцыі. Сітуацыя патрабуе пастаяннага кантролю з улікам паведамленняў аб зніжэнні даступнасці і ўжывання некаторых наркотыкаў, такіх як гераін і какаін, сумесна з узнікненнем хатняй вытворчасці амфетамінаў у некаторых краінах і павелічэннем ужывання іншых больш лёгкадаступных псіхаактыўных рэчываў.
- Нацыянальным органам улады і пастаўшчыкам паслуг, магчыма, трэба падумаць пра тое, як укараніць інавацыйныя падыходы, напрыклад, анлайн-кансультацыі і псіхалагічную падтрымку, прыём лекаў АЗТ дома і дыстанцыйныя паслугі, як знізіць урон, звязаны з наркотыкамі, бо гэта можа мець важнае значэнне для прыцягнення і ўтрымання тых, каму патрэбны паслугі, звязаныя з наркотыкамі. Адначасова з гэтым медыцынскія службы могуць па-ранейшаму несці дадатковы цяжар, звязаны з гарантаваннем бяспекі як кліентам, так і пастаўшчыкам медыцынскіх паслуг, пакуль не з’явіцца эфектыўнае лячэнне ад COVID-19 ці вакцына супраць віруса.

# Рэсурсы пра COVID-19

## ЕЦМНН

Тэматычныя старонкі пра COVID-19 і наркотыкі: http://www.emcdda.europa.eu/topics/covid-19

## Еўропа

Еўрапейскі цэнтр прафілактыкі і кантролю захворванняў: https://www.ecdc.europa.eu/en/novel-coronavirus-china

Ініцыятыўная група па рэагаванні Еўрапейскай камісіі: https://ec.europa.eu/info/live-work-travel-eu/health/coronavirus-response_en

Еўрапейскі навуковы медыяцэнтр (Еўрапейскі парламент): https://sciencemediahub.eu/

СААЗ (Еўропа): http://www.euro.who.int/en/home

## Астатнія краіны свету

Цэнтры прафілактыкі і кантролю захворванняў: https://www.cdc.gov/coronavirus/2019-nCoV/index.html і https://www.cdc.gov/coronavirus/2019-ncov/community/homeless-shelters/plan-prepare-respond.html

СААЗ: https://www.who.int/emergencies/diseases/novel-coronavirus-2019